УДК [2–172.2+929.5]:7.046.1((94(368)+476)

# КАСМАГОНІЯ І ГЕНЕАЛОГІЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ І СКАНДЫНАЎСКАЙ МІФАЛОГІІ

***Ю. С. Барадзін,*** *аспірант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжаны ролі касмагоніі і генеалогіі ў язычніцкіх культурах вікінгаў і беларусаў. Аб’ектамі даследавання з’яўляюцца беларускі і скандынаўскія народы ў змесце касмаганічных і генеалагічных міфаў. Прааналізавана навуковая і гістарычная літаратура па беларускай, агульнаславянскай і скандынаўскай міфалогіі з мэтай адлюстраваць стварэнне космасу з хаосу, а таксама працы філосафаў, якія разглядаюць ролю генеалогіі як вяртанне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, радавой і гістарычнай памяці.

**Ключавыя словы:** космас, хаос, багі, вікінгі, беларусы, Дэміург, міфы, паганства, першапродак.

# COSMOGONY AND GENEALOGY IN BELARUSIAN AND SCANDINAVIAN MYTHOLOGY

***Y. Borodin,*** *Postgraduate Student of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the roles of cosmogony and genealogy in the pagan cultures of Vikings and Belarusians. The objects of the study are the Belarusian and Scandinavian peoples in the context of cosmogonic and genealogical myths. In the publication, the author turns to scientific and historical literature on Belarusian, All-Slavic and Scandinavian mythology to show the creation of the cosmos from chaos, as well as to learned philosophers who reveal the role of genealogy as the return and preservation of historical and cultural heritage, family and historical memory.

**Keywords:** space, chaos, gods, vikings, Belarusians, demiurges, myths, paganism, progenitor.

У беларускай і скандынаўскай міфалогіях, як і ва ўсіх міфалогіях свету, касмагонія і генеалогія выступаюць як гісторыя прадстаўленняў аб сусвеце. Касмаганічныя і генеалагічныя міфы займаюць важнае месца ў міфапаэтычнай творчасці. Касмагонія апісвае абставіны, пры якіх адбывалася ўзнікненне сусвету з хаосу (да пачатку стварэння свету не было нічога, акрамя цемры і змроку). З хаосу ўзнік космас, цемра ператварылася ў святло, пустэча – у запоўненасць. Потым Дэміург стварыў усё жывое – неба, зямлю, прыроду, жывёл і чалавека. Аб стварэнні і радаводзе багоў апавядаюць генеалагічныя міфы, якія з’яўляюцца часткай касмаганічных міфаў.

Згодна з канцэпцыяй французскага філосафа Мішэля Фуко, генеалогія змяшчае тое, што адбылося, збірае падзеі мінулага. На яго погляд, генеалогія – не «адкрыццё новага», а даследаванне гістарычнага мінулага з мэтай яго захавання каб чалавецтва ў будучыні мела ўражанне аб старажытнай гісторыі і продках, якія жылі яшчэ ў часы паганства. Генеалогія вяртае радавую памяць, якая ў свядомасці чалавека адраджаецца нанова. Звяртаючыся да сваіх каранёў, чалавек пасцігае гісторыка-культурную спадчыну свайго народу і атрымлівае прадстаўленне аб тым, чым жылі і кіраваліся яго продкі, у якіх багоў яны верылі, як багі стваралі космас.

Нямецкі філосаф Фрыдрых Ніцшэ тлумачыць, што першапродак найбольш магутнага роду ператвараецца ў бога. У скандынаўскай міфалогіі Буры (бацька Бора і дзед вярхоўнага Одзіна) – першапродак багоў і першачалавек. Менавіта ў генеалогіі раскрываецца паходжанне беларускіх і скандынаўскіх дэміургаў. Ніцшэ разглядае генеалогію як навуку аб самім паходжанні роду [1].

Ніцшэ падкрэсліваў, што высакародныя пакаленні надавалі сваім продкам і прабацькам (багам, героям) свае ж уласцівасці – высакародныя якасці. Такім чынам героі сярод беларусаў і вікінгаў адчувалі сваю прыналежнасць да багоў, у іх прачыналіся галасы як старажытных продкаў, так і Дэміурга.

Генеалогія вывучае радавод (бацька і сын, дзед і ўнук, прадзед і праўнук, альбо прадстаўнік роду – «праўнук Бога»). Акрамя таго, што беларусы і вікінгі верылі ў паганскіх багоў, яны таксама называлі сябе нашчадкамі дэміургаў (вікінгі – сыны і нашчадкі вярхоўнага Одзіна, бога вайны і перамогі; беларусы – унукі Дажбога, бога сонца). Такім чынам, славянскія і скандынаўскія народы верылі ў сваё паходжанне ад багоў.

У агульнаславянскай міфалогіі бог неба Род разам з Белбогам і Чарнабогам стварылі свет і чалавецтва. Нягледзячы на тое, што Белбог і Чарнабог – браты, паміж імі пастаяннае суперніцтва [5, с. 119]. Бог цемры і зла Чарнабог імкнецца нашкодзіць людзям на зямлі, а Белбог, насупраць, робіць усё, каб не даць яму канчаткова падпарадкаваць свет злу. Ад аднаго з сыноў першабога Рода – бога агню і кавальства Сварога – паходзяць бог-грамабой Пярун, бог ветру Стрыбог, бог вясны Ярыла і бог сонца Дажбог. У Перуна ёсць жонкі – багіня лета Цётка-Грамаўніца і багіня кахання Лада, у якой нарадзілася дачка – багіня вясны Лёля. Аб паходжанні багоў ёсць і супярэчнасці: калі ў беларускай міфалогіі Пярун і Ярыла – сыны Сварога, то ў славянскай Пярун – сын Белбога, Ярыла – сын бога-апякуна і хатняй жывёлы Вялеса. Таксама калі ў славянскай міфалогіі ёсць апісанне стварэння космасу багамі Родам, Белбогам і Чарнабогам, то ў беларускай міфалогіі, як падкрэслівае беларускі міфолаг і навуковец А. М. Ненадавец, амаль адсутнічаюць звесткі пра стварэнне свету. Згодна А. М. Ненадаўцу, космас – гэта залатое яйка, якое свеціцца залатым колерам [4, с. 26]. Аднак ёсць і падабенствы: свет у беларускіх і

скандынаўскіх міфах трымаецца на сусветным дрэве жыцця. У беларусаў дрэва свету назву не мае, у скандынаваў завецца Ігдрасіль [2, с. 84].

У скандынаўскай міфалогіі ад першачалавека Буры паходзіць бог Бор, а ад Бора – тры сыны-стваральнікі свету: вярхоўны бог вікінгаў Одзін і яго браты Ві і Веле. Яны забілі волата Іміра, з якога стварылі сусвет. Ад Усебацькі скандынаваў Одзіна таксама паходзяць бог вясны Бальдр, сляпы Хёд, аднарукі бог вайны і гонару Цюр, багі помсты Валі і Відар, вартаўнік багоў і сусветнага дрэва Хеймдаль, грамабой Тор з свяшчэнным молатам Мельёнірам. Дачкамі Одзіна лічыліся валькірыі, якія забіралі з поля бою душы загінуўшых з мячом у руцэ ваяроў. З унукаў Одзіна значную ролю выконваюць сын бога вясны Бальдра, бог-суддзя Фарсэці, які судзіў забойцу свайго бацькі – бога агню, хітрасці і падману Локі. Сам Локі ў свой час спарадзіў для Одзіна васьміногага каня Слейпніра, які стаў уласнай жывёлай бога вайны і перамогі; пачварнага ваўка Фенрыра – будучага забойцу Одзіна, і змея Ярмуганда – злейшага і мацнейшага ворага Тора, а таксама змрочную валадарку Хель, якая прымала ў сваё поўнае цемры валадарства вікінгаў, памерлых без мяча ў руцэ і таму не трапіўшых у Вальхалу – палац Усебацькі Одзіна. Будучы героямі-ваярамі, вікінгі верылі ў сваю роўнасць з Одзінам і ў тое, што ў Вальхале іх чакае агульны з багамі баль. Пасля гераічнай смерці на полі бою яны станавіліся эйнхерыямі, якія ў будучыні прымуць удзел у апошняй вайне багоў з пачварамі [3, с. 110].

Асамі называлі багоў, якія пайшлі ад Одзіна, а ванамі – ад бога ветру Ньёрда, у прыватнасці, бог сонца Фрэйр і багіня вайны і кахання Фрэйя, якая прымала частку паўшых ваяроў у палацы Сесрумніры і ў полі Фольквангу.

Пасля гібелі Одзіна і Тора ў дзень Рагнароку – фінальнай бітвы паміж багамі і волатамі – радавод працягнуць сыны Тора і ўнукі Одзіна – бог фізічнай сілы Магні і бог ваяўнічай лютасці Модзі. Яны ўспадкуюць ад свайго бацькі молат Мельёнір і разам з сынамі Одзіна – богам помсты Відарам і братамі Бальдрам і Хёдам – будуць кіраваць ужо новым адроджаным светам, дзе больш не будзе месца для барацьбы дабра са злом. Уладу над новым светам скандынаваў успадкуе па бацьку Одзіну ўваскрослы бог вясны Бальдр, які разам з Хёдам вызваліцца са змрочнага валадарства Хель – дачкі Локі.

У адрозненні ад скандынаўскай міфалогіі, у беларускай поўнасцю адсутнічае эсхаталогія – канец свету і гібель багоў. Акрамя таго, беларускія багі бяссмертныя, скандынаўскія – такія ж смяротныя, як людзі. Ёсць і іншыя адрозненні. У скандынаваў толькі героі трапляюць у палац Одзіна Вальхалу. У беларусаў душы памерлых ператвараюцца ў птушак і адлятаюць у Вырай (слав. «Ирий»). У беларускай міфалогіі адсутнічае пекла, а ў славянскай у змрочным пекле Наві прымае і катуе душы грэшнікаў Вій – сын Чарнабога, як і скандынаўская Хель, у якой

пакутуюць тыя вікінгі, якія памерлі ганебнай і негераічнай смерцю. Душы здраднікаў і подлых забойцаў такім жа чынам карае цмок Нідхёг у калодзежы Хвергельмір і ў царстве змроку Ніфльхейм. Нідхёг атрутнымі зубамі перыядычна грызе дрэва свету Ігдрасіль, такім чынам скарачаючы жыццё ўсяму скандынаўскаму свету і чалавецтву. У міфалогіі беларусаў, у адрозненні ад свету скандынаваў, якому наканавана загінуць ад вогненнага мяча волата Сурта, а затым зноў адрадзіцца, замест эсхаталогіі будзе няспынная барацьба паміж багамі дабра і зла: Белбогам і Чарнабогам, змаганне Пяруна з нячысцікамі, якія шкодзяць людзям. Дабро будзе перамагаць зло, але і зло не будзе пераможаным канчаткова.

З самых старажытных часоў, яшчэ за некалькі стагоддзяў да прыходу хрысціянства, паганская міфалогія выхоўвала ў чалавеку пачуццё адказнасці за свае дзеянні на зямлі і адчуванне таго, што дабро пераможа зло, а зло не застанецца беспакараным для таго, хто яго робіць. Як у беларусаў, так і ў скандынаваў, акрамя касмаганічных і генеалагічных міфаў, ёсць прадстаўленне аб замагільным жыцці пасля смерці, аб барацьбе і змаганні паміж дабром і злом, святлом і цемрай. Дабро змагаецца за тое, каб захаваць космас і ўсё жывое, створанае багамі. Зло, насупраць, імкнецца знішчыць усё жывое, падобна волату Сурту, які вогненным мячом у дзень Рагнарок спаліць сённяшні скандынаўскі свет перад нараджэннем новага космасу, у якім будзе працягвацца радавод тых багоў і людзей, якія перажылі агонь Сурта. З дапамогай генеалагічнага дрэва даследуюцца дынастыі скандынаўскіх конунгаў (вярхоўных кіраўнікоў вікінгаў), славянскіх князёў (напрыклад, кіеўскіх і полацкіх), беларускіх і скандынаўскіх дэміургаў.


1. *Асоян, Ю. А.* Проект генеалогии: от «генеалогии морали» Ницше к «генеалогии этики» Фуко / Ю. А. Асоян // Вестн. культурологии. – 2018. – № 1 (84). – С. 71–91.

2. *Ванкукер, З.* Викинги. Полная история / З. Ванкурер ; ред. М. П. Николаева. – М. : АСТ, 2020. – 320 с. – (История на пальцах).

3. *Коа, И.* Викинги, короли морей / И. Коа. – М. : АСТ : Астрель, 2003. – 176 с. – (История. Открытие).

4. *Ненадавец, А. М.* Выявы міфалагічнага выраю / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 263 с.

5. *Фаминцын, А. С.* Божества древних славян / А. С. Фаминцын. – М. : Академич. проект, 2012. – 315 с. – (Технологии культуры).